Уся ўвага студэнтаў нашага універсітэта прыкавана да Масквы, да Крэмлёўскага Палаца з'ездаў, дзе працягвае сваю работу XXIII форум камуністаў. З гарачым адабрэннем сустракаюць яны рашэнні XXIII з'езда КПСС.

На здымку: студэнты чытаюць матэрыялы XXIII з'езда КПСС.

Фота А. Кадзета.

ЯРКАЙ РЫСАЙ СУЧАСНАЙ ЭПОХІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА НЕБЫВАЛА ІМКЛІВАЕ РАЗВІЦЦЁ НАВУКІ, ЯЕ ЎСЁ БОЛЬШ МОЦНЫ ЎПЛЫЎ НА ЎСЕ БАКІ МАТЭРЫЯЛЬНАГА І ДУХОЎНАГА ЖЫЦЦЯ. У НАШ ЧАС НЕ МАГЧЫМА ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ВЫСОКІЯ ТЭМПЫ РОСТУ ПРАДУКЦЫЙНЫХ СІЛ, ТЭХНІЧНАГА ПРАГРЭСУ БЕЗ ШЫРОКА ПАСТАЎЛЕНЫХ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ І ХУТКАГА АСВАЕННЯ ІХ ВЫНІКАЎ У ВЫТВОРЧАСЦІ. ПЕРАТВАРЭННЕ НАВУКІ Ў НЕПАСРЭДНУЮ ПРАДУКЦЫЙНУЮ СІЛУ Ў КОРАНІ МЯНЯЕ ХАРАКТАР ПРАЦОЎНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЧАЛАВЕКА. ВА ЎМОВАХ САЦЫЯЛІЗМА НАВУКА МЯНЯЕ НЕ ТОЛЬКІ ХАРАКТАР ПРАЦЫ ЧАЛАВЕКА, АЛЕ І ЎВЕСЬ МАТЭРЫЯЛЬНЫ І ДУХОЎНЫ ЎКЛАД ЯГО ЖЫЦЦЯ.

(З даклада Першага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева 29 сакавіка 1966 года на XXIII з'ездзе КПСС).

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 12 (635) Пятніца, 8 красавіка 1966 года. Год выдання XIX. Цана 1 кап.

НЯХАЙ КВІТНЕЕ НАША РАДЗІМА

З неаслабнай увагай я сачу за работай XXIII з'езда КПСС. У дакладзе Першага сакратара ЦК КПСС Леаніда Ільіча Брэжнева, у выступленнях дэлегатаў, адчуваецца дзелавітасць, вялікая заклапочанасць Камуністычнай партыі аб далейшым развіцці ўсіх галін народнай гаспадаркі СССР, аб росце матэрыяльных і духоўных сіл народа. Новы пяцігадовы план, які будзе прыняты з'ездам, — гэта яшчэ адзін крок па шляху будаўніцтва камунізма.

Савецкае студэнцтва горача адклікаецца на любы кліч партыі. Сёлета ў чацверты раз студэнты нашага універсітэта паедуць на ўдарныя камсамольскія будоўлі Казахстана і Сібіры. Выдатнікі вучобы і там паказваюць прыклады стараннай працы. Летась універсітэцкі атрад заняў першае месца ў цаліным будаўніцтве. На ўсесаюзным злёце ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў, дзе адбываецца XXIII з'езд КПСС, нам быў уручан памятны Чырвоны сцяг, які цяпер з'яўляецца дарагой рэліквіяй камсамоліі БДУ.

І зноў студэнтаў клічуць у дарогу казахстанскія стэпы, будоўлі Сібіры. Рашэнні з'езда натхняюць нас на яшчэ большыя працоўныя справы.

Уладзімір ВЯЛІЧКА.
член КПСС, старшыня прафбюро філфака, начальнік аддзела Рэспубліканскага цаліннага штаба.

АБ ДАБРАБЫЦЕ НАРОДА

Далейшы рост зарабатнай платы з'яўляецца яркім прыкладам таго, што наша партыя і урад праяўляюць вялікія клопаты аб павышэнні жыццёвага ўзроўню савецкіх людзей. Не ў прыклад ураду ЗША, які клапоціцца толькі аб павышэнні ваеннага бюджэту. З'езд паказаў, што наша партыя ўдзяляе і будзе ўдзяляць яшчэ больш увагі далейшаму развіццю адносін і ўмацаванню братэрскай дружбы паміж брацкімі Камуністычнымі партыямі.

Хочацца хутчэй закончыць універсітэт, каб зліцца ў адзіны працоўны мускул з нашым народам і прыкласці ўсе свае сілы і старанне для хутчэйшага выканання новай пяцігодкі, для пабудовы камунізма ў нашай краіне.

Аляксандр ТАБАЧНІКАЎ.

ВАМ НАШЫ ГАРАЧЫЯ ВОПЛЕСКІ



Максім ЛУЖАНІН дае аўтографы студэнтам (верхні здымак). Кастусь КІРЭЕНКА з сваёй кнігай вершаў «Слаўся, юнацтва» у цесным гурце студэнтаў (здымак унізе).

Фота С. СУПРУНА.

У актавай зале галоўнага корпуса нашага універсітэта адбыўся вялікі літаратурны вечар паэзіі. Гэта была сустрэча беларускіх паэтаў і членаў універсітэцкага літаб'яднання «Узлёт» са студэнтамі. На вечары выступілі вядомыя беларускія паэты Максім Лужанін, Кастусь Кірэенка, Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, кіраўнік універсітэцкага літаб'яднання «Узлёт» паэт Алег Лойка і іншыя.

Малады сатырык-гумарыст Мікола Вяршынін, які з'яўляецца студэнтам вячэрняга аддзялення гістарычнага факультэта, а працуе інжынерам аддзела бяспекі на Мінскім падшыпнікавым заводзе, прачытаў свой вершаваны фельетон «Пра згоды і разводы», а таксама верш «Студэнт заўжды на ўсё гатовы». Ён разам з Леанідам Дайнекам і Мар'янам Дуксам, вершы якіх таксама прыемна сустрэлі прысутныя вечара, стаў пераможцам абласнога фестывалю маладой камсамольскай паэзіі і быў дапушчаны да ўдзелу ў рэспубліканскім фестывалі.

У студэнтаў, выкладчыкаў універсітэта назаўсёды застанецца добры ўспамін аб гэтай цудоўнай сустрэчы.

В. МІКОЛАЎ.

ПЕРАМОЖЦЫ ВЫЗНАЧАНЫ

У пачатку навучальнага года ў нашым універсітэце быў аб'яўлен конкурс на лепшую студэнцкую групу. Умовы конкурса патрабавалі: выдатнай вучобы, стопрацэнтнага наведвання лекцый, актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці факультэта. Акрамя гэтага ўлічвалася і навукова-даследчая работа студэнтаў.

Стартавалі ўсе факультэты, а да фінішу прыйшлі нямногія. Прысваенне прызавых месц у групах гуманітарных факультэтаў рашылася проста. Тут у працэсе семестра быў вызначаны пераможца. Лепш за ўсіх выканала ўмовы конкурса першая група трэцяга курса юрыдычнага факультэта, першая група другога курса беларускага аддзялення заняла другое месца, трэцяе—першая група чацвертага курса гістарычнага факультэта.

Пры вызначэнні пераможца на прыродазнаўчых факультэтах выявіліся некаторыя недакладнасці. Пры складанні ўмоў конкурса не ўлічылі таго, што пятыя курсы па паспяховасці могуць заняць першыя месцы, а па іншых пунктах — апошнія. Лепш было б на гэтых факультэтах пятыя курсы не ўключаць у конкурс. Атрымалася, што пятыя курсы па паспяховасці і наведванню лекцый занялі першае месца, а затое ўсе астатнія ўмовы імі не выкананы.

СТАРТУЕ ЛЕНІНСКАЯ ЭСТАФЕТА

Таму ім прыйшлося ўступіць першае месца больш моцнаму саперніку конкурса — першай групе чацвертага курса матфака. На другім месцы аказалася трэцяя група трэцяга курса фізфака і трэцяе месца прысвоена першай групе другога курса хімфака.

Аднак, нельга лічыць, што ў групах, якія занялі прызавыя месцы ўсё ідзе добра. Тут яшчэ таксама многа «пасіўных» студэнтаў, якія цягнуць гэтыя групы назад. Таму і атрымліваецца, што паспяховасць выдатнал, а грамадская работа слабая. Цяпер, калі камсамольцамі нашага універсітэта прынята Ленінская эстафета, думаецца, што «пасіўных» будзе менш у нашых радах.

Неўзабаве пераможцы конкурсу атрымаюць узнагароды. Іх чакае паездка ў Ленінград, Маскву, Брэст, Рыгу, Вільнюс (па выбару).

Навукова-акадэмічная камісія прафкома універсітэта.

ПА УНІВЕРСІТЭТУ

ПРЫ УНІВЕРСІТЭЦЕ створан камітэт па падрыхтоўцы да знамянальнай даты ў жыцці нашага народа — 50-годдзя Савецкай улады. Днямі адбылося яго чарговае пасяджэнне. Старшыня камітэта прарэктар па навучальнай рабоце прафесар В. І. Сцяпанаў паставіў новыя задачы — пачаць падрыхтоўку да стварэння маламетражнага фільма пра гісторыю нашага універсітэта, а таксама мемарыяльнай дошкі з увекавечваннем памяці выкладчыкаў універсітэта, якія загінулі ў барацьбе за Савецкую ўладу ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

БЫЛЫЯ СТУДЭНТЫ, выпускнікі мінулых год, а цяпер настаўнікі школ, спецыялісты народнай гаспадаркі краіны нядаўна з'ехаліся на традыцыйную сустрэчу, якая штогод праводзіцца ва ўніверсітэце. Дэканы факультэтаў расказалі ім аб росце кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага калектыву, аб павелічэнні набору студэнтаў на стацыянар у гэтым годзе. Выпускнікі ў сваю чаргу расказалі шмат цікавага з сваіх працоўных будняў.

ДЛЯ СТУДЭНТАЎ-ПЯЦІКУРСНІКАЎ гістарычнага факультэта наступілі радасныя дні. На размеркаванні, якое адбылося днямі, яны атрымалі накіраванні на работу. У добры працоўны шлях, таварышы!

ХІМФАК СЁННЯ

★ ★ ★ ★ ★

«ХІМІК» У ЛІКУ ЛЕПШЫХ

У мінулым годзе наша насценная газета «Хімік» заняла апошняе месца. З ім пачаў працаваць цяперашні склад рэдкалегіі. На першым жа пасяджэнні было пастаўлена пытанне: з чаго пачынаць сваю работу? Доўга меркавалі, рашалі ўсе разам, а калектыў немалы — пятнаццаць чалавек. Парашылі падзяліцца на дзве групы. Адна, скажам, адзін выпусціць нумар, а другая праз тыдзень — другі. Але з гэтага нічога не атрымалася. Таму вырашылі рабіць газету разам.

Вялікую дапамогу ў выпуску газеты нам аказвала і аказвае партыйнае бюро факультэта. Таварышы з партбюро дапамаглі нам, як спланаваць і што ўключыць у першы нумар газеты. Асабліва многа дапамаглі нам П. П. Сіліванчык і В. Г. Шлык. Нядаўна нам на дапамогу па свайму асабістаму жаданню прыйшоў А. С. Баркан, вопытны педагог і газетчык. І адразу ж ён удыхнуў у нашу работу нешта новае, свежае: разбор кожнага чарговага нумару, як лепш размячаць матэрыялы на газетнай паласе, падбіраў і падказваў рэдкалегіі арыгінальную тэматыку.

Стала працаваць лягчэй. Падружыўся і калектыў. Кожны дапамагае адзін аднаму. Улюбёна працуе галоўны мастак нашай газеты Саша Гівенкаў. Яму дапамагаюць мастакі Люда Краўчанка, Толя Жукоўскі, Алік Цімашэнка. За некалькі месяцаў работы стараннымі карэспандэнтамі сталі Лора Бабіч, Таня Прыбыткова і іншыя.

Якія ў нас планы? Думаем да сесіі выпусціць яшчэ некалькі нумароў, у якіх асвятліць жыццё і побыт студэнтаў усіх нашых курсаў і груп. Адзін нумар аб падрыхтоўцы да сесіі і адзін—вынікам сесіі. Выпусцім таксама некалькі дадаткаў да гэтых нумароў.

Калектыў наш працуе старанна, укладвае ў гэта шмат энергіі. Думаю, што вынікі ў нас будуць добрыя.

Г. КАЖУШКОЎ,
рэдактар насценнай газеты «Хімік».

СА ШКОЛЫ— У НАВУКУ

Бадай, ні адзін выкладчык нашага універсітэта не атрымаў такі дарагі падарунак да дня 8-га сакавіка, як Таіса Пятроўна Адамовіч: Вучоны Савет прысудзіў ёй навуковую ступень кандадата хімічных навук.

Таісу Пятроўну я ведаю даўно, амаль дзевятнаццаць год, з тае самае пары, як мы паступілі на першы курс хімфака нашага універсітэта. Усе пяць год вучобы яна была нашым добрым таварышам, яе любілі і паважалі ўсе студэнты курса.

Пасля заканчэння універсітэта Таіса Пятроўна атрымала накіраванне на працу ў школу. Выдатніца шмат старанння, энергіі і ўмельства прыкладвала для выхавання нашай моладзі. Вопытным педагогам вярнулася Таіса Пятроўна праз сем гадоў ва універсітэт і паступіла ў аспірантуру. З той пары вось ужо шэсць год яна працуе ў калектыве нашай кафедры. Першыя тры гады прайшлі за навуковай работай, пасля Таіса Пятроўна стала асістэнтам і вось, нарэшце, абаронена дысертацыя. Выдатных поспехаў вам у навуцы, Таіса Пятроўна!

В. В. СВІРЫДАЎ,
дацэнт.

ПАБУДУЮЦЬ ХІМКОРПУС І...

На хімфаку будзе газ—гэта раз!

Усюды будзе чысціня—гэта два!

Будзе цяга! Не хлусі! Гэта тры.



Будуць практыкумы шчыры! Гэта, бачыце, чатыры.

А пакуль трэба чакаць. Гэта пяць.

КАНСТРУКЦЫЯ ПЛАНАЎ УСКЛАДНЯЕЦЦА

Прайшло паўгода. Мільганула зімовая сесія, а на хімфаку так і не ўбачылі па-сапраўднаму цікавай, баявой работы камітэта камсамола, якім кіруе студэнт першага курса Сяргей Стройкін.

На справаздачна-выбарным камсамольскім сходзе факультэта ў мінулым годзе крытыкавалася работа бюро камітэта камсамола. І, здаецца, усе яго памылкі былі ўскрыты так востра, што больш іх на хімфаку ніколі не будзе.

Здавалася і толькі... Давайце крыху прыпомнім мінулае і зробім спробу прааналізаваць цяперашняе.

Мінулагодні камітэт камсамола крытыкаваўся за тое, што не праводзіў камсамольскіх сходаў. Цяперашні камітэт не рэгулярна праводзіць камсамольскія сходы і таму таксама будзе крытыкавацца за гэта. Па Статуту ВЛКСМ камсамольскія курсавыя сходы павінны праводзіцца адзін раз у месяц. У нас, на хімфаку, яны праводзяцца адзін раз ў паўгода, ды і то не заўсёды. Адсюль, на мой погляд, і пачынаюцца пасіўныя адносіны некаторых студэнтаў-хімікаў да грамадскіх спраў.

Адносна правядзення камсамольскіх сходаў на факультэце можна зрабіць яшчэ некалькі заўваг. У нас стала традыцыяй праводзіць іх напярэдадні сесій. Але ў гэтым годзе гэтая традыцыя парушана. Чаму? Магчыма, на гэтае пытанне адкажа т. Стройкін?

У камітэце камсамола не знайшлося сіл і волі назаўсёды вырашыць няправільнае меркаванне: пакідаць пяты курс ў баку ад усіх камсамольскіх спраў. А хіба на пятым курсе вучацца не камсамольцы? Камсамольцы! Хіба на іх не распаўсюджваецца патрабаванне захоўваць Статут ВЛКСМ, хіба на іх курсах не павінны рэгулярна праводзіцца курсавыя сходы? Па меркаванню некаторых членаў бюро камітэта камсамоле — не. А калі так— то камітэт камсамола праводзіць гэты кірунак ва ўсіх напрамках.



— Пяты курс? Ды ў іх жа заняткі...

— Пяты курс? Ды ў іх жа дыпломная...

Выходзіць, што для хімікаў—пяцікурснікаў прабыванне на даным этапе ва універсітэце — чыстая фармальнасць. У камітэце камсамола не пазінна быць ніякага падзелу.

Адзінае, чым можа ганарыцца камітэт камсамола факультэта — гэта добрае правядзенне падпіскі на часопісы і газеты.

Якая ж дысцыпліна саміх членаў камітэта? На пасяджэннях рэдка збіраюцца ўсе яго члены. Часта не бывае нават паловы. Патрэбна неадкладна ліквідаваць гэты недахоп. Ён з'яўляецца адной з тых галоўных прычын, якія канстатуюць аб нездавальняючай рабоце камітэта камсамола факультэта.

Б. КЛІМОВЕЦ.

ЭКАНОМЦЕ ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЮ!

Эканомія электрычнасці дае нашай народнай гаспадарцы вялікі эканамічны эфект. Хімфак траціць многа электраэнергіі. А ці ўся яна ператвараецца ў карысную работу? Не, не заўсёды! Паглядзіце, колькі ўключана сушыльных шафаў, муфельных пячэй! Часта бывае так, што яны працуюць ухаластую. Праф'юро хімфака лічыць, што за эканомію электраэнергіі павінен несці адказнасць кожны студэнт. Кожнаму з нас перш за ўсё патрэбна ўстанавіць дзейсны кантроль за самім сабой і сваімі таварышамі. Ніколі без асаблівай патрэбы не падключаць апараты і не ўключаць святло.

Мы думаем, што ў гэтым пытанні нам будзе ў значнай меры дапамагаць «Камсамольскі пражэктар». Трэба таксама добра падумаць над тым, як рацыянальна спланаваць карыстанне электрычнасцю. Тут у нас ёсць шмат недакладнасцей.

І. СЯМЕНАЎ.

СПРАВЫ ДРУЖЫННІКАЎ ПАТРЭБНЫ НАРОДУ

Калісьці дабраахвотная народная дружына хімфака займала адно з вядучых месц сярод дружын універсітэта. Хімікі пільна няслі службу па навядзенню парадку ў раёне. Так было нават і ў мінулым годзе, але ў даны момант нашу работу нельга разглядаць так, як раней. Цяпер наша дружына займае нешта сярэдняе, нельга сказаць, што работа добрая, але і нельга падумаць, што ў нас ідуць справы горш, чым на іншых факультэтах.

Што здарылася, якія тыя прычыны, што прыводзяць да пагоршання работы дружыны? Партыйнае бюро, а таксама камітэт камсамола не праяўляюць дастатковай увагі рабоце народнай дружыны, не дапамагаюць у арганізацыі і правядзенні дзяжурстваў. Прыкрым з'яўляецца тое, што сярод дружыннікаў няма ніводнага выкладчыка факультэта, а яны маглі б аказваць нам вялікую дапамогу. Справа яшчэ ўскладняецца і тым, што не ўсе студэнты правільна асэнсоўваюць тое даручэнне, якое ўскладаюць часам на іх. Калі ўгаварваеш такіх дзяжурыць, яны адмаўляюцца, гавораць, што справы народнай дружыны пабудаваны на дабраахвотнасці. Такія «дружыннікі» не ведаюць нават, дзе знаходзіцца штаб народнай дружыны.

Студэнты С. Дзямідаў, В. Каспяровіч, Т. Вераб'ёва, С. Аржанкаў рэгулярна выходзяць на дзяжурства. На шостым злёце дружыннікаў С. Аржанкава, С. Дзямідава ўзнагарадзілі каштоўнымі падарункамі. Раўняйцесь на іх, таварышы!

В. ПРАКАПОВІЧ,
камандзір народнай дружыны хімфака.

У ДРУЖБЕ З НАРОДНАЙ МУДРАСЦЮ

Відаць, не памылюся, калі скажу, што ўсе мы любім вусную народную творчасць: былiны, казкі, загадкі, прыказкі, прымаўкі, прыпеўкі, народныя песні. Гэта сапраўдныя залатыя зліткі народнай мудрасці. Кожны народ па-свойму мудры, бо кожны па-свойму выказвае свае лепшыя мары, жаданні, свае адносіны да той ці іншай з'явы жыцця. Выказвае сцісла і трапна тое, чым усхвалявана сэрца, чаго не можа ўтаіць душа, урэшце, тое, што даўно ўжо сур'ёзна асэнсаваў чалавечы розум.

Мы любім народную мудрасць, што нараджалася вякамі і не баялася састарыцца, завучваем і вывучаем яе.

Кенійскім студэнтам групы № 6 падрыхтоўчага факультэта ў гэтым сэнсе, як кажуць, пашанцавала. Старшы выкладчык падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян Віктар Васільевіч Рэвіцкі — вялікі аматар вуснай народнай творчасці. Ён падрыхтаваў і неўзабаве будзе абараняць кандыдацкую дысертацыю на тэму: «Сучасная народная паэтычная творчасць Беларусі і некаторыя заканамернасці яе развіцця». Сваю любоў да народнай мудрасці ён прывівае і студэнтам з далёкага афрыканскага кантынента.

Амаль з самага пачатку навучальнага года, як толькі замежныя таварышы завучылі некалькі дзесяткаў рускіх слоў і навучыліся звязваць іх у сказы, Віктар Васільевіч зацікавіў іх прыказкамі і прымаўкамі.

Прыказкі і прымаўкі—гэта нібы залатыя россыпы ў фальклоры. Праз іх коратка і проста народ выказвае вялікі сэнс сваіх думак, ідэй.

І кенійскія студэнты выводзілі на дошцы і ў сшытках, паўтараючы па некалькі разоў народныя выразы. Вельмі па духу прыйшліся студэнтам суровыя і мужныя словы, што любіла паўтараць Даларэс Ібаруры «Лепш памерці стоячы—чым жыць на каленях!». Кенійскія студэнты ведаюць цяпер, што сказаць на рускай мове падпальшчыкам вайны «Хто сее вецер— той пажне буру». А студэнты Кананго Самсон, Лівінгстон Капеен і Даніэль Пуньуа ведаюць нават некалькі казак.

Знаёмства з фальклорам вялікага рускага, беларускага і іншых народаў дапамагае замежным сябрам лепш зразумець народную творчасць сваіх народаў, горача палюбіць яе. Гэта многаму дапамагае ім і ў вывучэнні рускай мовы, дапамагае пранікнуць у тайны мовы вялікага рускага народа, лепш зразумець яго шматгадовую гісторыю.

Ул. ГАЛАЙША.

В. а. рэдактара Ул. КУЛАЖАНКА

Калектыў выкладчыкаў і студэнтаў філалагічнага факультэта нашага універсітэта выказвае глыбокае спачуванне сакратару факультэта Мшыхінай Ірыне Мікалаеўне з выпадку напаткаўшага яе вялікага гора — заўчаснай смерці бацькі.

АТ 00856 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 503.